УДК 811.161.3’373:81’42

**Доўгаль Алеся Валер’еўна**
Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова
(г. Магілёў, Беларусь)
dovgal_av@msu.by

# ЛЕКСІЧНА-ФРАЗЕАЛАГІЧНЫЯ МАРКЕРЫ ВЕРБАЛЬНАЙ АГРЭСІІ Ў ІНТЭРНЭТ-КАМУНІКАЦЫІ

У артыкуле разглядаюцца тэкставыя каментарыі ў сацыяльных сетках, якія ўтрымліваюць агрэсіўную інтэнцыю і з’яўляюцца прыкладам дэструктыўнай камунікацыі з негатыўнай эмацыйнай танальнасцю. Адзначаецца, што каментарыі маюць наступныя асаблівасці: добраахвотнасць, асінхроннасць, аб’ектная скіраванасць, канфліктнасць. Аналізуюцца інвектыўныя лексічныя адзінкі, якія з’яўляюцца маркерамі вербальнай агрэсіі ў інтэрнэт-каментарыях у сацыяльных сетках. Робіцца выснова, што ўжыванне такіх адзінак абумоўлена прагматычнай устаноўкай адрасанта: абраза апанента, мэтанакіраванае выражэнне ўласных негатыўных эмоцый, уцягненне адрасата ў камунікатыўны канфлікт.

**Ключавыя словы:** вербальная агрэсія, інтэрнэт-камунікацыя, каментарый, лексічны маркер, інвектыўная лексіка

The article examines text comments on social networks that contain aggressive intent and are an example of destructive communication with a negative emotional tone. It is noted that comments have the following features: voluntariness, asynchrony, object orientation, conflict. The invective lexical units that are markers of verbal aggression in online comments on social networks are analyzed. It is concluded that the use of such units is due to the addresser's pragmatic attitude: insulting an opponent, purposefully expressing one's own negative emotions, involving the addressee in a communicative conflict.

**Keywords:** verbal aggression, Internet communication, comment, lexical marker, invective words

У сучасных даследаваннях розных галін навук (псіхалогіі, псіхіятрыі, сацыялогіі, педагогікі, крыміналогіі, лінгвістыкі) адзначаецца, што агрэсія як форма канфліктных паводзінаў займае усё больш трывалыя пазіцыі ў розных сферах чалавечай дзейнасці, у тым ліку ў камунікацыі. Агрэсіўныя формы зносінаў прысутнічаюць сёння ў любым тыпе дыскурсу (бытавым, палітычным, медыйным, педагагічным, мастацкім і інш.), а таксама на ўзроўні як інтэрперсанальнай, так і групавой і масавай камунікацыі. Лінгвісты востра крытыкуюць маўленчую агрэсію, зважаючы на тое, што яна прыводзіць да зніжэння ўзроўню маўленчай культуры грамадства ў цэлым, вульгарызацыі і інвектывізацыі маўлення носьбітаў мовы.

Пад маўленчай (вербальнай) агрэсіяй у лінгвістычных навуковых працах разумеецца свядомае камунікатыўнае дзеянне (маўленчы акт) з мэтай здзейсніць негатыўнае эмацыйнае ўздзеянне на адрасата і дэфармаваць яго камунікатыўную прастору. Прывядзём некаторыя азначэнні гэтай з'явы: "маўленчая грубасць у дачыненні да суразмоўніка, якая праяўляецца ў адборы рэзкіх, зняважлівых слоў, у тым ліку нецэнзурнай лаянкі, насмешлівых інтанацый, у павышэнні гучнасці голасу, у рэзка адмоўных ацэнках суразмоўніка, непрыемных для яго намёках, грубай іроніі і інш." [1, с. 7]; "выкарыстанне моўных сродкаў для выражэння непрыязнасці, варожасці; манера маўлення, якая абражае чыё-небудзь самалюбства, годнасць" [2, с. 340].

"Спрыяльным" асяродкам для існавання, трансляцыі і развіцця вербальнай агрэсіі з'яўляецца інтэрнэт-камунікацыя. Сацыяльныя сеткі ствараюць прастору для свабоднага самавыражэння, якога бракуе ў рэальнай камунікацыі, а магчымая ананімнасць і, як следства, ўяўная безадказнасць у віртуальным жыцці "сцірае дазволеныя межы этычных стандартаў узаемадзеяння, і тады для некаторых людзей знявага, хамства і жорсткасць становяцца нормай" [3, с. 186].

Інтэрнэт-камунікацыя належыць да пісьмовых форм зносінаў, таму індыкатарам агрэсіі тут з'яўляецца перадусім вербальны кампанент, г.зн. лексічныя, граматычныя і стылістычныя адзінкі.

У прапанаваным артыкуле спынімся на лексічных маркерах вербальнай агрэсіі ў інтэрнэт-камунікацыі на прыкладзе каментарыяў да тэкставых паведамленняў у сацыяльных сетках (Facebook, Вконтакте). Пад лексічнымі маркерамі вербальнай агрэсіі будзем разумець словы, якія маюць негатыўную

эматыўна-ацэначную семантыку і з'яўляюцца сродкамі выражэння агрэсіўнай інтэнцыі адрасанта – выказвання знявагі, абразы, непрыязнага стаўлення, насмешак і пад. у грубай форме на адрас іншага камуніканта.

Мэта любога каментарыя ў сацыяльных сетках – гэта самапрэзентацыя аўтара і ўздзеянне на іншых карыстальнікаў праз выказванне суб'ектыўных меркаванняў як у вербальнай, так і невербальнай форме (праз графічныя выявы). Асаблівасцю такой камунікацыі з'яўляецца добраахвотнасць удзелу ў ёй: карыстальнік не абавязаны выказваць свае думкі, сам вызначае ступень удзелу / няўдзелу ў дыялогу. Даследчыкі адзначаюць, што "зносіны ў каментарыях – гэта асінхронны працэс, які не патрабуе непасрэднай рэакцыі, а значыць, маўленчая агрэсія ў меншай ступені выклікана эмацыйнасцю, што ўласціва рэальнай камунікацыі" [4, с. 3]. Гэта сведчыць пра большую ступень наўмыснасці вербальнай агрэсіі ў анлайн-камунікацыі ў параўнанні са зносінамі ў рэальным жыцці, дзе эмацыйныя рэакцыі, у тым ліку і вербальная грубасць і знявага, праяўляюцца сінхронна з актам маўлення, а значыць менш свядома і падкантрольна. Вербальная агрэсія ў кіберпрасторы з'яўляецца аб'ектнаскіраванай формай камунікацыі: аб'ект можа быць прамым (гэта карыстальнік сеткі, якому непасрэдна адрасавана паведамленне), а таксама ўскосным (гэта трэцяя асоба, якая не прадстаўлена ў камунікатыўнай сітуацыі, але з'яўляецца яе рэферэнтам – прадметам маўлення). Таму вербальная агрэсія як форма канфліктнай, дэструктыўнай камунікацыі [5] можа быць прамой і ўскоснай і ажыццяўляцца праз шэраг тактык [6].

Інструментарый сродкаў вербальнай агрэсіі ў сацыяльных сетках дастаткова шырокі. Індыкатарамі вербальнай агрэсіі ў інтэрнэт-каментарыях перадусім з'яўляецца негатыўна-ацэначная эматыўная лексіка, ці інвектывы (грубыя словы, якія прыніжаюць годнасць іншага чалавека). Да такіх адзінак адносяцца прамыя найменні адрасата агрэсіі (кантэксты падаюцца з захаваннем аўтарскай арфаграфіі і пунктуацыі): ***чучело****, тебе не по барабану, что тут и как????; И ещё ты полнейшее* ***хамло*** *с униженным чувством собственного достоинства; Тупой* ***клоун****!; Каждый день встречаю такого* ***рогатокопытного*** *на кольце!; Какая же она* ***страшила*** *на фото….*

Паказчыкамі зневажальнага стаўлення можна лічыць грубыя звароты да адрасата праз намінацыі па полавай прыналежнасці, сацыяльным статусе, роду дзейнасці і пад., напрыклад: *Включи логику* ***женщина****!!!; слышь "****Яжмать****" угомонись, вас уже везде!; Всё что пишут эти* ***блохеры*** *враньё!*

Сацыяльныя сеткі даюць камунікантам практычна абсалютную свабоду самавыражэння і словатворчасці, таму ў каментарах нярэдка сустракаюцца аўтарскія інвектыўныя неалагізмы (*быдлобомж, ублюдосина, муд@к@ны, яжемать* і інш.). Падобныя лексемы сведчаць пра фарміраванне адмысловай аксеалагічнай прасторы інтэрнэт-камунікацыі.

Маркерамі агрэсіўнай інтэнцыі з'яўляюцца характарыстыкі аб'екта агрэсіі, выражаныя негатыўна-ацэначнымі лексемамі (часцей прыметнікамі),

напрыклад: ***Жалкий** и **смешной** ))) эко тебя зацепило ))) иди мамке в юбку поплач; как можно быть такой **тупой** і **ограниченной**???; понял, женщина вы уже в возрасте, но **совсем без мозгов**, сочувствую и так слишком много написал, живите со своей **дурной** головой и дальше.*

Сродкамі трансляцыі вербальнай агрэсіі выступаюць таксама грубыя найменні дзеянняў адрасата: *ещё у одной старой вороны **крыша поехала**; Ты ж Моська, а на слона **тявкаешь**; Мало зарабатывал, захотелось много. Когда уже "**нажрутся**"? Лучше бы перечислил какому нибудь детскому дому, на тот свет не заберешь; **С жиру бесятся**!*

Маркерамі тактыкі грубага патрабавання ці пажадання, як правіла, выступаюць імператыўныя формы дзеяслова або формы абвеснага і ўмоўнага ладоў у значэнні загаднага: *Дык **ня гаўкай**, **супакойся**!; **Хватит** ахинею **нести**!!!; **Прикрой** свой рот и **не лезь** туда куда не нужно; Почему **бы вам не заткнуться**!*

Відавочным паказчыкам агрэсіўных маўленчых паводзінаў з'яўляюцца нецэнзурныя лаянкавыя словы і выразы, якія ўжываюцца для абразы адрасата і выражэння негатыўных эмоцый. Прыклады такіх адзінак былі зафіксаваны ў абедзвюх сацыяльных сетках. Па сваёй прыродзе гэта самыя таксічныя і агрэсіўныя інвектывы не толькі ў віртуальнай, але і рэальнай камунікацыі.

Такім чынам, сродкамі дыягназавання вербальнай агрэсіі ў сацыяльных сетках выступаюць інвектыўныя лексемы з негатыўнай эматыўна-ацэначнай канатацыяй (размоўныя, прастамоўныя, жаргонныя, стылістычна зніжаныя, лаянкавыя адзінкі). Іх ужыванне абумоўлена прагматычнай устаноўкай адрасата: абраза апанента, мэтанакіраванае выражэнне ўласных негатыўных эмоцый, уцягненне адрасата ў камунікатыўны канфлікт.

Даследаванне выканана ў межах ДПНД 2021–2025 гг (заданне ДР № 20211335).

**Літаратура**

1. Романова, Н. Н. Агрессия (агрессивность) речевая / Н. Н. Романова // Словарь. Культура речевого общения: этика, прагматика, психология / Н. Н. Романова, А. В. Филиппов. – М. : Флинта : Наука, 2016. – С. 7.

2. Трошева, Т. Б. Речевая агрессия / Т. Б. Трошева // Стилистический энциклопедический словарь русского языка / под ред. М. Н. Кожиной. – 2-е изд., стереотип. – М. : Флинта : Наука, 2011. – С. 340.

3. Фетисова, Т. А. Агрессивное поведение в Интернет-коммуникации / Т. А. Фетисова // Вестник культурологии. – 2018. – № 4. – С. 185–197.

4. Моисеева, А. В. Флейминг как форма речевой агрессии в интернет-коммуникации / А. В. Моисеева, А. С. Титлова // Russian Linguistic Bulletin. – 2022. – № 2. – С. 1–4.

5. Доўгаль, А. В. Маўленчая агрэсія як паказчык канфліктнай інтэрперсанальнай камунікацыі / А. В. Доўгаль // Немецкий язык – лингводидактическое обеспечение и методика преподавания – III: сб. науч. статей / под ред. Е. Е. Иванова. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2023. – С. 97–100.

6. Доўгаль, А. В. Тыпы і тактыкі вербальнай агрэсіі ў інтэрперсанальнай камунікацыі ў сацыяльных сетках / А. В. Доўгаль // Весці БДПУ. Серыя 1. – 2023. – № 3 (117). – С. 88–91.